BSU və BDPU
Birgə nəşr

№ 1 2010

Elmi əsərlər
Dil və ədəbiyyat seriyası
İctimai-siyasi elmlər seriyası

Сумеснае выданне
БСУ і БДПУ

Вучоныя запіскі
Серыя мовы і літаратуры
Серыя грамадска-палітычных навук

М.М.ЗАБАЎСКІ

# ПЕРШЫ ВОПЫТ БЕЛАРУСКАГА ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ. ВЫБАРЫ І ДЗЕЙНАСЦЬ ДЭПУТАТАЎ АД БЕЛАРУСІ Ў РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ (1906-1917 гг.).

Сучасная палітычная сітуацыя ў краіне патрабуе звароту да гісторыі парламентарызму, якая даволі багатая сваімі традыцыямі і вопытам дзейнасці, у тым ліку на складаных, пераломных этапах гісторыі ў пачатку XX ст. Гэта дазваляе глыбей зразумець размеркаванне палітычных сіл, пазітыўны і негатыўны вопыт дзейнасці нашых папярэднікаў у вырашэнні галоўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны, у першую чаргу аграрнага нацыянальнага, рабочага і інш.

Ва умовах, калі выпрацаваны асновы нацыянальнай палітыкі, калі існуюць дзве палаты вышэйшага заканадаўчага органа, асабліва важна акцэнтаваць увагу не столькі на першых кроках станаўлення парламентарызму, колькі на аналізе трансфармацыі поглядаў палітычных партый на нацыянальныя праблемы ў вышэйшай прадстаўнічай установе царскай Расіі. Пастаноўка нацыянальнага пытання ў Думе мае навуковае, пазнавальнае значэне, а таксама выклікае палітычны і практычны інтарэс. Як і ў пачатку XX ст., нацыянальныя лозунгі даволі папулярныя у палітычнай барацьбе партый і рухаў, якія імкнуцца выкарыстаць у сваіх інтарэсах пачуццё нацыянальнай свядомасці мас. Найбольш яскрава апошняе праявілася ў імкненні да развіцця культуры, у першую чаргу адукацыі на роднай мове.

20 лютага 1906 г. былі выданы Маніфест і Палажэнне аб дзейнасці Дзяржаўнага Савета, а таксама Палажэнне аб заканадаўчай Думе. У "Палажэнні" былі раздзелы прысвечаныя складу і структуры Думы, рэгламенту работы, пытанням яе кампетэнцыі, парадку справаводства і г.д. Членам Думы гарантавалася недатыкальнасць асобы, свабода думак па справах. якія

абмяркоўваліся Думай, яны не былі абцяжараны справаздачамі перад выбаршчыкамі. У 1906 г. у сувязі з выбарамі ў Думу ў Расіі разгарнулася барацьба партый і груп рознай ідэалагічнай і палітычнай арыентацыі за ўплыў на народныя масы і галасы выбаршчыкаў. У Беларусі на выбарах перамаглі кадэты. З 36 дэпутатаў ад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай губерняў – 29 прайшлі пад кадэцкім сцягам. Пры падтрымцы Канстытуцыйна-каталіцкай партыі, сіяністаў і "Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі". З 7 астатніх дэпутатаў 5 адносілі сябе да беспартыйных, 1 да сацыял-дэмакратаў і 1 – да правых. Вынікі выбараў у Думу напалохалі органы ўлады, манархістаў і памяркоўных.

Першая Дума праіснавала 72 дні. Адзіным законам, які яна прыняла былі асігнаванні (15 млн. руб.) у распараджэнне ўрада на харчовыя патрэбы. Пачатак работы Думы ў красавіку 1906 г. супаў з уздымам рэвалюцыйнага руху. Ён паўплываў і на дзейнасць дэпутатаў. Прадстаўнікі ад Беларусі выказаліся ў сваёй большасці за замацаванне зямлі ў асабістую ўласнасць. 8 дэпутатаў далучыліся да фракцыі аўтанамістаў.

І Дума была абвешчана Мікалаем ІІ крамольнай. Дэпутаты абвінавачваліся ў тым, што ўхіляліся ад заканадаўчай працы, імкнуліся ў абход цара змяніць Асноўныя законы краіны і сваёй уладай вырашыць аграрнае пытанне. Пасля роспуску Думы губернатары атрымалі ўказ пільна сачыць за былымі дэпутатамі і пра ўсе антызаконныя дзеянні іх даводзіць да ведама, а мясцовая адміністрацыя паставіла задачу цалкам ізаляваць іх ад любых зносін з насельніцтвам. Так, 15 ліпеня ў Брэсцкім павеце "за агітацыю сярод слян" арыштавалі дэпутата І Думы С.П. Кандрашука. Ён прабыў у турме 6 месяцаў.

12 – 18 снежня 1907 г. асобая ўстанова (присутствие) Пецярбургскай судовай палаты прыгаварыла 167 былых дэпутатаў І Дзяржаўнай думы, што падпісалі Выбаргскую адозву, да трох месяцаў турмы кожнага, пазбавіўшы іх выбарчых праў.

Выбары дэпутатаў у Бедарусі ў ІІ Думу праходзілі ў лютым 1907г. Віленскі епіскап Э.Ю. Роп прыклаў усе намаганні для стварэння блока землеўладальнікаў і сялян. "Яднайцеся з памешчыкамі, - гаварыў ён, - выбірайце разумных і інтэлігентных католікаў, а калі выбераце іншых, яны вас загубяць, касцёлыператвораць у канюшні." Агітацыя Э.Ю. Ропа дала плённыя вынікі. На губернскі выбарчы сход у Вільню на выбары дэпутатаў у Думу 6 лютага з'ехаліся 92 выбаршчыкі. 44 прадстаўнікі землеўладальнікаў, 40 былі ад сялян, 7 – ад гараджан, 1 – ад рабочых. Сярод землеўладальнікаў прысутнічалі вядомыя ў краі палітычныя дзеячы, у прыватнасць С.А. Ванькові́ч, Б.Ялавецкі, І Корвін – Мілеўскі і інш. Ім удалося прыцягнуць на свой бок 23 сялян і правесці ў Думу вядомага польскага літаратара, ганаровага суддзю Свянцянскага павета А.С. Хамінскага, вядомага спецыяліста па эканоміцы і

сельскай гаспадарцы краю М.Г. Хялхоўскага, графа Л.С. Путкамера. Памешчыка С.А.Ваньковіча і каталіка, валаснога суддзю, селяніна С.В. Пілейку.

Другая Дзяржаўная дума прыступіла да работы 20 лютага 1907 г. Выступленні сялян зводзіліся да малазямелля і патрабаванняў іх дадатковага надзялення зямлёй на правах уласнасці. Урад загадзя ведаў, што ў выпадку непадпарадкаванасці ўладам і непрацаздольнасці II Дума будзе распушчана, а выбарчы закон зменены. так і адбылося.

Мікалай II 3 чэрвеня 1907 гг. падпісаў указ пра яе роспуск. Адначасова быў надрукаваны новы выбарчы закон па выбарах у Дзяржаўную думу 3-га склікання, які ішоў у разрэз з Маніфестам ад 17 кастрычніка 1905 г. і Асноўнымі законамі Расійскай імперыі. Такім чынам, царызм ажыццявіў так званы трэццячэрвеньскі дзяржаўны пераварот, які азначаў паражэнне рэвалюцыі 1905 – 1907 гг.

Палітычная сітуацыя ў краіне рэзка змянілася, што адбілася на ходзе і выніках выбараў. Манархічныя партыі, праваслаўнае духавенства ставілі сабе за мэту ўнесці раскол паміж сялянствам, рабочымі, дэмакратычнымі слаямі гараджан, для чаго выкарыстоўвалі лозунгі вялікадзяржаўнага шавінізму і антысемітызму. Найбольш актыўна яны дзейнічалі ў Беларусі, Літве, Украіне. У 15 губернях так званай мяжы яўрэйскай аселасці налічвалася каля 60% усіх членаў “истинно–русских” арганізацый.

Ва умовах палітычнай рэакцыі выбарчую кампанію ў Беларусі ўзначалілі “Саюз рускага народа”, “Рускі ўскраінны саюз”, якія выступалі пад лозунгам “Расія для рускіх і рускія павінны ёю кіраваць!”. Абапіраючыся на падтрымку мясцовых органаў улады, яны вялі барацьбу супраць дэмакратычных і ліберальных партый (у першую чаргу кадэтаў) і газет, а таксама тых арганізацый, якія з’яўляліся выразнікамі інтарэсаў польскіх памешчыкаў і яўрэйскай буржуазіі. Пэўным уплывам сярод насельніцтва Заходняй Беларусі і Літвы ў 1907 – 1908 гг. карысталіся “Краёвая партыя Літвы і Беларусі” і каталіцкае духавенства. Яны імкнуліся павесці пад сваім сцягам беларускіх сялян – каталікаў і дамагчыся палітычнага панавання ў краі шляхам арганізацыі земстваў згодна Палажэнню 1890 г.

У адпаведнасці з выбарчым законам ад 3 чэрвеня 1907 г. памешчыцкая курыя атрымлівала 51% выбаршчыкаў Еўрапейскай Расіі, у тым ліку ў Мінскай губерні 51,2% выбаршчыкаў, у Віленскай – 48%, у. Віцебскай – 45,3% і ў Гродзенскай губерні – 41,1%. Паніжаны працэнт выбаршчыкаў ад землеўладальнікаў у Віцебскай, Віленскай і Гродзенскай губернях устанаўлаваўся ўрадам з мэтай абмежаваць прадстаўніцтва польскага дваранства ў Думе. Акрамя таго, у Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях сходы землеўладальнікаў, а ў Мінскай губерні і сходы гарадскіх курый праводзіліся па нацыянальнаму прынцыпу. Праваслаўныя беларусы пры гэтым далучаліся да “рускай”, а каталікі – да “польскай” курый. БСГ

спыніла нелегальную дзейнасць, актывісты і прыхільнікі партыі згуртаваліся вакол газеты “Наша ніва”.

1 верасня 1907 г. пачаліся выбары ў заходніх губернях. Дробныя землеўладальнікі не праяўлялі значнай актыўнасці, бо не різлічвалі перамагчы на павятовых сходах поўнацэнзавікоў (буйных памешчыкаў, якія валодалі правам напрамую абіраць выбаршчыкаў на губернскі выбарчы сход). На апошніх і быў разлічаны новы выбарчы закон. Землеўладальнікі выбіралі 283 выбаршчыкі, у той час як па закону ад 11 снежня 1905 г. – 246. Павелічэнне колькасці выбаршчыкаў было неаднолькавае па паветах. У тых, дзе “польскае” землеўладанне перавышала, колькасць выбаршчыкаў зменьшылася і адпаведна павялічылася там, дзе пераважала “рускае”.

З 283 выбаршчыкаў ад землеўладальніцкай курыі 55,4% уваходзілі ва ўрадавыя партыі. Калі ўлічыць, што ад першага сходу гарадскіх выбаршчыкаў прайшло 20% правых, а ад другога – 11%, а таксама 117 са 176 правых выбаршчыкаў ад сялян, то на апошняй стадыі выбараў відавочна пераважалі прыхільнікі ўрадавых партый і груповак.

Выкарыстаўшы перавагу, дадзеную выбарчым законам, падтрымку дзяржаўных органаў і царквы, акцябрысцка – манархічны блок заваяваў на выбарах у Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і гродзенскай губернях 15 дэпутацкіх мандатаў. Усяго ад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў у Дзяржаўную думу 3-га склікання прайшлі 29 правых і 7 лібералаў. У ліку апошніх адзін мірнааднаўленец і 6 дэпутатаў ад Краёвай партыі Літвы і Беларусі. Можна канстатаваць, што ў Паўночна – Заходнім краі ўплыў правых партый на выбаршчыкаў, асабліва сялян, быў больш значны, чым па імперыі ў цэлым. Шавіністычная палітыка царызму, якая распальвала нацыянальную варожасць паміж беларусамі і палякамі, беларусамі і яўрэямі. рускімі, палякамі і яўрэямі давала магчымасць чарнасоценцам дзейнічаць больш актыўна.

Дэпутаты правых партый ад беларуска – літоўскіх губерняў, у тым ліку сяляне, актыўна падтрымлівалі ўрадавую палітыку, аграрную і земскую рэформы П.А.Сталыпіна. Па аграрным пытанні частка сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі выказаліся за неабходнасць надзялення зямлёй малазямельных сялян. У ходзе передвыбарчай барацьбы ў органах друку правых партый і арганізацый, у думскіх спрэчках праявілася імкненне праваслаўнага беларускага заможнага сялянства з дапамогай урада дамагчыся абмежавання ў беларуска – літоўскіх губернях польскага памешчыцкага землеўладання і павялічыць за яго кошт уласнае.

Звязваючы ажыццяўленне сваіх інтарэсаў з нацыянальнай палітыкай царызму, думскія дэпутаты ад праваслаўнага беларускага заможнага сялянства і яго групоўкі на месцах (таварыства “Крестьянин”, “Белорусское общество”) вялі барацьбу з беларускім нацыянальным рухам, з газетай

"Наша ніва". Такую ж пазіцыю ў адносінах да гэтага руху займалі польскія памешчыкі, клерыкалы і думскія дэпутаты ад Віленскай губерні (польска – літоўска – беларуская групоўка).

"Наша ніва" не падтрымала ўвядзенне нацыянальных курый, паколькі новы выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. зусім не ўлічваў факт існавання беларускай нацыі, адносіў праваслаўных беларусаў да "рускай", а католікаў – да "польскай" курый. Газета крытыкавала шавіністычную дзейнасць рускіх і польскіх памешчыцкіх арганізацый, а таксама мясцовай адміністрацыі.

У трэццячэрвеньскі перыяд адным з галоўных сродкаў барацьбы з рэвалюцыйным рухам царызм выбраў адкрыта шавіністычную палітыку – наступ на "іншародцаў" і "іншаверцаў", у заходніх губернях – на палякаў, католікаў і яўрэяў. За падобную палітыку выступалі чарнасоценныя з'езды памешчыкаў, правы друк, якія вылучылі ідэю аб стварэнні ў заходніх губернях земстваў, якія б выбіраліся "нацыянальнымі" курыямі, пры ўмове забяспячэння перавагі "рускай курыі". Увядзенне земстваў на такой аснове дазваляла пакончыць з манаполіяй польскага прадстаўніцтва ў Дзяржаўным савеце ад Заходняга краю.

Дэпутаты ад беларускіх губерняў, польскія памешчыкі і каталіцкае духавенства, якія ўваходзілі ў польска – літоўска – беларускую групу выказаліся ў абарону земстваў, але без нацыянальных курый.

У 1912 г. на аснове выбарчага закона ад 3 чэрвеня 1907 г. прайшлі выбары ў Дзяржаўную думу 4-га склікання. Насельніцтва зноў было падзелена па нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці на курыі, сярод якіх пераважала руская. Мясцовыя органы улады адкрыта абапіраліся на крайне правыя арганізацыі. Выбарчая кампанія адбывалася пад сцягам узмацнення пазіцыі дваранства ў Думе і навогул у палітычным жыцці краіны. У цыркулярах, разасланых у губерні за подпісам міністра ўнутраных спраў А.А. Макарава, прадпісвалася весці выбарчую кампанію ў саюзе і згодзе з дваранствам, а таксама шырока прыцягваць праваслаўнае духавенства.

Для гэтай выбарчай кампаніі быў характэрны найбольшы абсентэізм у параўнанні з усімі папярэднімі. Поўную абыякавасць праявілі дробныя землеўладальнікі. З 280 выбаршчыкаў ад землеўладальніцкай курыі большасць уваходзіла ў партыі і групоўкі кансерватыўна – манархічнага лагера. Масавыя няяўкі выбаршчыкаў на першай стадыі выбараў былі зафіксаваны сярод яўрэйскага насельніцтва і сялянства заходніх губерняў. Колькасць губернскіх выбаршчыкаў у IV Дзяржаўную думу па Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у параўнанні з выбарамі ў II Думу павялічылася з 542 да 579 чалавек. Гэта акалічнасць тлумачылася ўзрастаючым уплывам правых партый і праваслаўных святароў і адбілася на партыйным складзе губернскіх выбаршчыкаў, што паўплывала і на партыйны склад дэпутатаў VI Думы ад 5 заходніх губерняў. "РУС", "Саюз

рускага народа" і вялікадзяржаўныя нацыяналісты заваявалі 27 месцаў. акцябрысты – 3, лібералы – 6 месцаў. Кадэты ўнеслі на абмеркаванне дэпутатаў Думы некалькі законапраектаў: аб дэмакратычных свабодах; аб усеагульным выбарчым праве і інш. Усе выступленні акцябрысцка – кадэцкага альянсу выклікалі негатыўную рэакцыю правай часткі Думы. Правыя патрабавалі ад урада узмацнення рэпрэсій, утаймавання "іншародцаў", большай увагі да царкоўнапрыходскіх школ. Мінскі епархіяльны місіянер К.М.Акаловіч заклікаў да новага "крыжовага паходу" супраць католікаў і ўмацавання пазіцый праваслаўнай царквы. Іншыя дэпутаты ад Беларусі таксама цвёрда стаялі на пазіцыях правых і нацыяналістаў. Сапраўдных абаронцаў сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа ў гэтай Думе не было. У карэспандэнцыі з Міншчыны Зм.Жылуновіч (Ц.Гартны) пісаў у "Нашу ніву", што ў Дзяржаўиай думе "... усе народы маюць сваіх прадстаўнікоў. якія змагаюцца за права сваёй нацыі. А наша Беларусь пасылае ў Думу толькі чарнасоценных дэпутатаў. Паўловічы ды Юрашкевічы, выступаючы ад беларускіх губерняў, толькі робяць шкоду і крыўду ўсім жыхарам сваімі чалавеканенавіснымі прамовамі, другія ж увесь час прасядзяць, слова не вымавіўшы."

Рэдакцыя "Нашай нівы" па-ранейшаму ўскладала надзеі на Думу, якая мусіла "расчысціць тую дарогу, на якую ірвалася ўся культурная Расія". Але на гэтым шляху, як адзначала газета, знаходзяцца правыя, акцябрысты і нацыяналісты.

Цар і яго акружэнне, "истинно – русскпе" і іх органы друку ў Беларусі не хацелі прызнаваць, што выспявае новая рэвалюцыя, урадавая палітыка церпіць крах і што нават партыі думскай большасці змянілі тактыку і перайшлі да канфрантацыі з урадам. Іх непакоіла тое, што "прагрэсіўныя партыі ўсё больш рашуча станавіліся на бок палякаў і яўрэяў". Акцэнт барацьбы супраць палякаў адбіваўся і на узмацненні крытыкі палітыкі Думы з боку "Нашай нівы".

Уступленне Расіі ў Першую сусветную вайну прывяло да ўсплёску шавіністычных настрояў у краіне. Манархісты, акцябрысты і прагрэсісты адкінулі палітычныя разнагалоссі і ўключыліся ў антыгерманскую істэрыю. У ліпені 1915 г. у Думе быў створаны "Прагрэсіўны блок", у які ўвайшоў і дэпутат ад Беларусі Ф.І. Лашкейт. У заходніх губернях правы друк, у прыватнасці, газеты "Виленскпй вестник", "Северо-Западная жизнь", рэзка выступіў супраць утворанага ў Думе блока, абвінавачваў яго ў пашырэнні правоў яўрэяў.

Прагрэсісты распрацавалі свой праект эканамічнага развіцця Расійскай імперыі. Паводле ўяўленняў тэарэтыкаў "прагрэсізму". ва ўмовах капіталістычнай мадэрнізацыі краіны "сцяг прагрэсу" з рук дваранства перайшоў да гандлёва – прамысловых дзеячаў. У адпаведнасці з гэтым стваралася но-

вая сістэма каштоўнасцей, цэнтральнай фігурай якой станавіўся "перадавы" прадпрымальнік. Прагрэсісты лічылі, што першачарговымі нацыянальнымі задачамі з'яўляліся пераўтварэнне Расіі ў развітую індустрыяльную краіну, стварэнне магутнага эканамічнага фундамента пад сістэмай новай прававой дзяржавы .

У 1916 г. у сувязі з набліжэннем фронту да Вільні выданне "Нашай нівы" спынілася. Расійскі дарэвалюцыйны парламент афіцыйна перастаў існаваць 6 кастрычніка 1917 г., калі пачаў работу II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Галоўная прычына таго, што Дзяржаўная дума не выканала сваёй гістарычнай місіі – не вырашыла галоўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця, -была ў адсутнасці падтрымкі яе з боку асноўнай масы насельніцтва. У Расіі адсутнічала традыцыя цывілізаваных адносін і кампраміснага вырашэння сацыяльных і палітычных канфліктаў. Недаацэньвалі ролю парламента імператар і падначалены яму ўрад. Пераход да праўядзення адкрытай палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму садзейнічаў яшчэ большаму размежаванню палітычных сіл і наблізіў новую рэвалюцыю.

Многія дэпутаты Думы сталі актыўнымі ўдзельнікамі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У прыватнасці, дэлегат ад Магілёўскай губерні падпалкоўнік Б.А. Энгельгардт прымаў у ёй непасрэды ўдзел. У ноч з 27 на 28 лютага 1917 г. ён стаў членам ЧКДзД. Да 3 сакавіла Б.А.Энгельгардт з'яўляўся старшынёй Ваеннага камітэта, начальнікам гарнізона Петраграда і камендантам Таўрычаскага палаца. Адначасова ён быў членам Выканаўчага камітэта савета афіцэрскіх дэпутатаў г. Петраграда. Балтыйскага флота і Асобнага корпуса пагранічнай стражы. Б.А. Энгельгард кантраляваў дзейнасць 179 начальнікаў ахоўных аддзяленняў, камендантаў раёнаў і ўстаноў, начальнікаў міліцыі.

Адной з яркіх палітычных асоб пачатку XX ст. быў Р.А. Скірмунт. Нарадзіўся ў 1868 г. у Пінскім павеце. Заснавальнік шэрагу ўстаноў на Мінскім палессе, ініцыятар збліжэння памешчыкаў з сялянамі і з гэтай мэтай прыёму апошніх на ільготных умовах у члены мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Дэпутат I Дзяржаўнай думы. У 1916 – 1918 гг. далучыўся да беларускага нацыянальнага руху.

Вялізарную работу па актывізацыі да палітычнай дзейнасці мясцовага польскага насельніцтва ў заходніх губернях праводзіў Віленскі епіскап барон Э.Ю.Роп. Заснавальнік канстытуцыйна – каталіцкай партыі Літвы і Русі (1906 г.). Дэпутат I Дзяржаўнай думы. Э.Ю. Роп адным з першых буйных дзеячоў каталіцызму ў Беларусі, хто прызнаў правы беларускай мовы

Пазадумная дзейнасць дэпутатаў шырока асвятлялася на старонках мясцовага перыядычнага друку, у прыватнасці газет: "Минское слово",

“Северо-западная жизнь”, “Наша ніва”, “Виленский вестник”, “Окраины России” і інш.

Нельга не пагадзіцца з прафесарам Казанскага дзяржаўнага ўніверсітэта Р.А. Ціунчуком, што “дзейнасць нацыянальных фракцый садзейнічала фарміраванню новых нацыянальных палітычных эліт. Многія дэпутаты сталі лідэрамі нацыянальных партый, а пасля 1917 г. кіраўнікамі дзяржаў, нацыянальных і рэгіянальных урадаў”.

Практычна ўсе аўтанамісты, абраныя ад 5 заходніх губерняў у Думу, былі адукаванымі, прэстыжнымі асобамі і склалі ўплывовую групу ў Расійскім парламенце. Акрамя таго, яны прадстаўлялі масы. Праўрадавая газета “Окраины России”, аналізуючы выбарчую кампанію ў І Думу, пісала: “Рускі народ, які жыве ў Мінскай губерні, прыняў актыўны ўдзел у абранні Р. Скірмунта. так што зараз ён можа лічыць сябе сапраўдным прадстаўніком насельніцтва.” У далейшым Р. Скірмунт неафіцыйна кантактаваў з беларускімі сацыялістамі адраджэнцамі, падтрымліваў іх культурніцкія праекты. У 1910 – 1911 гг. быў членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. З сакавіка да ліпеня 1917 г. з’яўляўся старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэта. Дзейнасць Р. Скірмунта садзейнічала з’яўленню беларускай палітычнай дзяржавы.

Такім чынам, выбарчыя кампаніі ў дарэвалюцыйную Расійскую Думу, дзейнасць рэгіянальных дэпутатаў адлюстроўвалі значнае ўскладненне палітычнай структуры краіны і выхаду на шырокую арэну нацыянальных лідэраў, якія выступалі за дэцэнтралізацыю ўлады, развіццё мясцовага самакіравання, адлюстроўвалі нацыянальную і канфесійную роўнасць. Але спадзяванні беларускіх нацыянальных лідэраў не ажыццявіліся. Усе плыні польскага руху ў Беларусі і Літве, якімі кіравалі Р. Дмоўскі і Ю. Пілсуцкі і іх прыхільнікі ўключыліся ў барацьбу за ўтварэнне польскай нацыянальнай дзяржавы. якая павінна была ўключыць у свой склад так званыя “усходнія крэсы”.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Дан, Ф.И. Выборы в Государственную думу по Положению от 3 июня 1907 г. (Разьяснение избирательного закона) / Ф.И. Дан. – Санкт-Петербург: Т-во “Художественной печати”. – 1912. – 31 с.

2. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 2008. – 266 с.

3. Кирьянов, И.И., Лукьянов, М.Н. Парламент самодержавной России. Государственная дума и её депутаты. – Пермь: Изд. Пермского ун-та. – 1995. – 157 с.

4. Лавриилович, Д.С. Либерально-консервативная оппозиция в России: формирование и борьба за власть (1912–1917 гг) / Д.С. Лавринович. – Могилёв: "Могилёв. гос. ун-т им. А.А. Кулешова", 2006. – 336 с.

5. Ольденбург, С.С. Царствование нмператора Николая II / С.С. Ольденбург. – Белград. – Т. 1. – 1939. – С. 246.

6. Сташкевіч, М.С. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX – люты 1917 г.) / М.С. Сташкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. с.32 – 37. № 4. с.29 – 34.

7. Сяменчык, М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – кастрычнік 1917 гг.): у 2-х ч. – Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2001. – Ч.1: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму. – 200 с.

8. Циунчук Р.А. Государственная дума в этноконфессиональном дискурсе Российской империи // Политическая и социокультурная трансформация в белорусском обществе. – Матерналы респ. научно – практ. конф. – Мн., 2006. – С. 51 – 53.

9. Шульгин, В.В. Годы – Дни. 1920. – М.: Новости. – 1990. – 828 с.